Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Петербурга // Сохранение культурного наследия библиотек, архивов и музеев : материалы науч. конф., Санкт-Петербург, 14–15 февр. 2003 г. Санкт-Петербург, 2003. С. 114.
2. Издания, возвращенные из Спецфонда, в Славянском фонде БАН: белорусский отдел : библиогр. указ. / сост.: М.В. Колмакова, Д.Ю. Чернышенко ; авт. вступ. ст. А.Н. Вабищевич ; отв. ред. Н.В. Колпакова. Санкт-Петербург : БАН, 2017. 260 с.
3. Библиотека Академии Наук СССР, 1728–1929 : краткий исторический очерк и путеводитель. Ленинград : Изд-во Акад. наук СССР, 1929. С. 68.
4. Императорская Академія Наукъ, 1889–1914 : II. Матеріалы для исторіи академическіхъ учрежденій за 1889–1914 гг. Петроград, 1917. Ч. 1. С. 33.
5. *Комиссарова Е.В.* Редкие белорусские издания XIX в. в Славянском фонде БАН // Белорусский сборник : статьи и материалы по истории и культуре Белоруссии. Санкт-Петербург, 2002. Вып. 2. С. 223–228.
6. Императорская Академія Наукъ, 1889–1914.

*Д.А. Крэнт*

## Падрыхтоўка першага манаграфічнага выдання па гісторыі Інстытута беларускай культуры ў Беларусі ў 1970–1980-я гг.

У дадзеным артыкуле прадстаўлены звесткі аб працэсе падрыхтоўкі першага ў Беларусі навуковага выдання па гісторыі Інстытута беларускай культуры. У рабоце даецца характарыстыка ступені вывучанасці гісторыі Інбелкульта да канца 1970-х гг. Прадэманстраваны рост інтарэсу да мінулага першай навуковай установы краіны, акрэслена ў агульных рысах канцэпцыя патэнцыяльнага выдання. На падставе дакументальных крыніц вызначаны прычыны спынення адзначанай публікацыі ў сярэдзіне 1980-х гг.


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

*Ключавыя словы:* Інстытут беларускай культуры, Акадэмія навук, гісторыя навукі, гістарыяграфія, БССР.

*Д.А. Крент*

**Подготовка первого монографического издания по истории Института белорусской культуры в Беларуси в 1970–1980-е гг.**

В статье представлена информация о процессе подготовки первого в Беларуси научного издания по истории Института белорусской культуры. Дается характеристика степени изученности истории Инбелкульта до конца 1970-х гг. Продемонстрирован рост интереса к прошлому первого в стране научного учреждения, в общих чертах рассмотрена концепция потенциального издания. На основе документальных источников установлены причины прекращения данного издания в середине 1980-х гг.

*Ключевые слова:* Институт белорусской культуры, Академия наук, история науки, историография, БССР.

*D. Krent*

**Preparation of the first monographic publication on the history of the Institute of Belarusian Culture in Belarus in the 1970s–1980s.**

This article provides information on the process of preparation of the first scientific publication concerning the history of the Institute of Belarusian Culture in the Belarus. The article describes the limits of knowledge of the history of Inbelkult until the end of the 1970s. The growth of interest in the country's first scientific institution's past is demonstrated, and the concept of an eventual publication is outlined. On the basis of



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

documentary sources, the reasons for the suspension of the above-cited publication in the mid-1980s were determined.

*Keywords:* Institute of Belarusian Culture, Academy of Sciences, history of science, historiography, BSSR.

На сённяшні момант гісторыі Інстытута беларускай культуры прысвечана значная колькасць навуковых, навукова-папулярных і публіцыстычных публікацый. Аднак працяглы час для кожнага даследчыка, які ў сваіх працах закранаў пытанні развіцця навукі ў 1920-я гг., базавым дапаможнікам для пачатку даследчых росшукаў з’яўлялася выдадзеная ў 1993 г. пад грыфам Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі калектыўная кніга «Інстытут беларускай культуры» [1]. Падрыхтоўка дадзенага выдання мае сваю гісторыю, па суб’ектыўных прычынах яго выхад з друку быў адцягнуты на цэлае дзесяцігоддзе.

Асэнсаванне мінулага першай навуковай установы Беларусі – Інстытута беларускай культуры да канца 1970-х гг. мела свае традыцыі вывучэння. Першыя падобныя працы былі падрыхтаваны супрацоўнікамі дадзенай установы ў 1920-я гг. [2]. Яны мелі падкрэслена інфармацыйны характар і не ставілі на парадак дня глыбокага ўсебаковага асэнсавання ўнёску арганізацыі, яе структурных падраздзяленняў і супрацоўнікаў у развіццё айчыннай навукі.

Асобна варта спыніцца на працах першай паловы 1930-х гг. Яны негатыўным чынам характарызавалі даследчыя практыкі вучоных Інбелкульта, а ў ідэйным рэчышчы пабудаваны на супрацьпастаўленні дзейнасці дадзенай установы і яе супрацоўнікаў з Беларускай акадэміяй навук [3]. Падобны падыход да асэнсавання працы Інбелкульта дазволіў аўтарам тэарэтычна абгрунтаваць неабходнасць арганізацыйнай трансфармацыі і змены



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

даследчых прыярытэтаў БАН у часы, калі яе ўзначальваў П. Горын.

У 1950-я гг. гістарыяграфія, прысвечаная дадзенай праблеме, ўзбагацілася даследаваннем Г. Нямігі «Інстытут Беларускай культуры. Беларуская Акадэмія Навук – Акадэмія Навук Беларускай ССР» (1957) [4]. Варта адзначыць тэндэнцыйны характар гэтай працы. Падрыхтаваная ў эмігранцкім асяродку, яна з’яўлялася супрацьлегласцю беларускіх савецкіх наратываў 1930-х гг. Дзейнасць Інбелкульта разглядалася як вышэйшая кропка разгортвання айчыннай навукі, а перыяд працы Беларускай акадэміі навук пачынаючы з 1931 г. характарызаваўся як час заняпаду і разгрому нацыянальных навуковых школ, пачатак «асавечвання» даследчай установы, які канчаткова адбыўся пасля другога этапу рэарганізацыі навуковага цэнтра ў 1936 г.

З канца 1960-х гг. закладваецца падмурак для паступовай трансфармацыі ўяўленняў аб дзейнасці Інбелкульта ў беларускай савецкай гістарычнай літаратуры. На дадзены час прыпадае пачатак актыўнай працы па зборы матэрыялаў, прысвечаных гісторыі Акадэміі, асабістых архіваў навукоўцаў, чыя даследчая дзейнасць была цесна звязана з працай вышэйшай навуковай установы краіны [5]. Паралельна працэсу выяўлення і назапашвання крыніцазнаўчай базы выбудоўваецца інфраструктура для даследаванняў, аб’ектам якіх з’яўлялася навуковая супольнасць. З пачатку 1970-х гг. у Беларусі пачало актыўна развівацца навуказнаўства, ў 1971 г. быў арганізаваны Аддзел навуковай інфармацыі па грамадскіх навуках у структуры Акадэміі навук. Пры інстытуце эканомікі з 1973 г. пачаў дзейнічаць сектар эканомікі навукі, а пры Інстытуце фізікі – сектар навуказнаўства. З 1973 г. пры Інстытуце гісторыі


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

дзейнічала група гісторыі навукі, якая ў 1980 г. была пераўтворана ў аднайменны аддзел [6].

У публікацыі супрацоўніка Інстытута гісторыі АН БССР М. Галенчыка, якая выйшла ў юбілейным выданні, прысвечаным гісторыі Акадэміі навук БССР, назіраецца адыход ад тэзісаў, агучаных у 1930-я гг. у дачыненні да працы Інбелкульта і яе супрацоўнікаў. М. Галенчыкам вялікае значэнне надаецца асвятленню ролі камуністычнай партыі ў арганізацыі першай вышэйшай навуковай установы Беларусі. Даследчык пазбягае ацэначных суджэнняў у адрас навукоўцаў Інбелкульта, характарызуе толькі іх навуковую дзейнасць. Аўтарам замацоўваецца генетычная сувязь Інбелкульта і дзейснай Акадэміі навук, фарміруецца станоўчы вобраз першай навуковай установы. Ён адзначае, што «навуковыя даследаванні Інбелкульта адпавядалі інтарэсам працоўнага народа, садзейнічалі аднаўленню народнай гаспадаркі рэспублікі і яе рэканструкцыі на савецкай аснове» [7].

Наяўнасць інстытуцыянальнага падмурка, папаўненне і распрацоўка крыніцазнаўчай базы, выпрацоўка акрэсленай у агульных рысах канцэпцыі месца і ролі Інбелкульта ў гісторыі беларускай навукі, зацікаўленасць акадэмічнага кіраўніцтва ў арганізацыі даследаванняў, прысвечаных гісторыі Акадэміі навук, стваралі спрыяльныя ўмовы для падрыхтоўкі «поўнафарматнай» працы, прысвечанай першай нацыянальнай навуковай установе краіны.

Дакументальныя крыніцы сведчаць, што ініцыятыва падрыхтоўкі асобнага выдання, прысвечанага гісторыі Інбелкульта, належала прэзідэнту АН БССР М. Барысевічу. Гэта ідэя была агучана М. Барысевічам падчас падрыхтоўкі ўрачыстасцяў, прымеркаваных да 50-годдзя Акадэміі навук, у канцы лютага 1979 г. [8]. Па інфармацыі М.І. Галенчыка, першапачаткова планавалася распрацаваць «юбілейнае выданне навукова-папулярнага характару,


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

аб’ёмам 8–10 друкаваных аркушаў» [9]. Кніга мусіла стаць індывідуальнай працай памянёнага даследчыка і павінна была выйсці з друку ў 1981 г. Па прапанове М. Барысевіча, падрыхтоўка выдання была зацверджана прыняццем пастановы Прэзідыума АН БССР ад 14 чэрвеня 1979 г. «Аб выданні кнігі “Інстытут беларускай культуры”» [10]. Падобная фармалізацыя падрыхтоўчага працэсу дэманструе значнасць патэнцыяльнай публікацыі для акадэмічнай навуковай супольнасці, яшчэ раз падкрэслівае замацаванне ідэі разумення месца Інбелкульта ў гісторыі як паўнавартаснага папярэдніка Акадэміі навук.

Агучаная канцэпцыя выдання, тэрміны і ўмовы яго падрыхтоўкі былі істотным чынам зменены ў наступным 1980 г. Пачатак гэтаму працэсу быў пакладзены рашэннем вучонага савета Інстытута гісторыі АН БССР. На яго пасяджэнні 8 лютага 1980 г. абмяркоўваўся даклад М. Галенчыка аб стане падрыхтоўкі кнігі. Сярод іншага даследчык даў характарыстыку зробленай працы, звярнуў увагу на ступень выканання даследавання (на момант даклада была падрыхтавана першая глава кнігі аб’ёмам 2 д. а. і дадаткі). Для павышэння эфектыўнасці і паскарэння працы М. Галенчык прапанаваў рэалізаваць наступныя захады:

– Падоўжыць тэрмін прадстаўлення кнігі ў выдавецтва да 1 лютага 1981 г.

– Вылучыць у дапамогу аднаго або двух лабарантаў для дапаможных прац.

– Асобна падкрэсліў немэтазгоднасць ідэі (якая была прапанавана М. Барысевічам – Д. К.) прыцягнення профільных спецыялістаў для напісання раздзелаў, прысвечаных асобным галінам ведаў [11].

Члены вучонага савета у сваю чаргу выказалі сумненне ў магчымасці дакладчыка аднаасобна падрыхтаваць кнігу ў заяўлены тэрмін, звярнулі ўвагу на перспектыўнасць і



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

рацыянальнасць прыцягнення да працы даследчыкаў-спецыялістаў [12]. Варта канстантаваць, што ў выніку за аснову пры далейшай падрыхтоўцы выдання былі ўзяты прапановы членаў вучонага савета. Апошняе паццвярджае той факт, што 18 сакавіка 1980 г. папярэдняя пастанова Прэзідыума АН БССР па выданні кнігі была істотным чынам перапрацавана. Згодна з дадзенымі перапрацоўкамі, тэрмін выхаду кнігі ссоўваўся на 1982 г. Акрамя таго, значныя змены акрэсліліся і ў канцэпцыі выдання: замест індывідуальнага даследавання навукова-папулярнага характару патэнцыяльная публікацыя павінна была стаць калектыўнай працай, да яе напісання былі прыцягнуты даследчыкі профільных інстытутаў Акадэміі навук і вышэйшых навучальных устаноў краіны [13]. Структурна патэнцыяльнае выданне павінна было стаць зборнікам навуковых нарысаў, якія групіраваліся ў чатыры главы: «Стварэнне Інстытута беларускай культуры»; «Развіццё грамадскіх навук», «Даследаванні ў галіне прыродазнаўчых навук», «Дзейнасць сектароў і самастойных камісій Інбелкульта. Краязнаўства» [14]. Быў зменены склад рэдкалегіі выдання. У яго ўвайшлі: старшыня М. Барысевіч, намеснік старшыні П. Петрыкаў, адказны сакратар М. Галенчык. Акрамя таго, у склад членаў рэдкалегіі былі ўведзены старэйшыя акадэмікі, пачатак навуковай дзейнасці якіх быў цесна звязаны з працай Інбелкульта: К. Атраховіч (Кандрат Крапіва) і Г. Гарэцкі [15].

Вялікі аўтарскі калектыў (у напісанні тэкстаў удзельнічалі 20 аўтараў), зацікаўленасць акадэмічнага кіраўніцтва ў падрыхтоўцы падобнага даследвання садзейнічалі таму, што рукапіс падрыхтаванай кнігі быў абмеркаваны на пасяджэнні вучонага савета Інстытута гісторыі 27 красавіка 1982 г. У цэлым кніга атрымала станоўчую адзнаку з боку супрацоўнікаў Інстытута


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

гісторыі. Актуальнасць падобнага даследавання, з аднаго боку, абгрунтоўвалася (на думку аўтараў, членаў вучонага савета і рэцэнзентаў рукапісу – *Д. К.*) навізной уведзененага ў навуковы ўжытак фактычнага матэрыялу, а з іншага – слабай распрацаванасцю праблемы гісторыі Інбелкульта. Асобна падкрэслівалася, што праца мусіла стаць адказам на існаваўшыя ў той час эміграцкія наратывы, прысвечаныя станаўленню і развіццю айчыннай навукі. На пасяджэнні вучонага савета Інбелкульт іменаваўся не менш як «цэнтр навуковай думкі ў рэспубліцы» [16]. Натуральна, што адным з галоўных станоўчых момантаў выдання называлася асвятленне «высілкаў партыі і ўраду рэспублікі» пры арганізацыі дадзенай навуковай установы [17]. Рэцэнзент У. Міхнюк несумнеўным плюсам кнігі лічыў, што «рэцэнзуймы рукапіс прадстаўляе сабой калектыўнае даследаванне, для падрыхтоўкі якога былі прыцягнуты профільныя спецыялісты. На сённяшні дзень – гэта адна з першых калектыўных навуковых прац, зробленых гісторыкамі ў творчай садружнасці з прадстаўнікамі іншых грамадскіх і прыродазнаўчых навук» [18]. Праца ў цэлым адпавядала прапанаванай у 1980-м г. структуры і падзялялася на 4 главы.

Разам з тым, пры асвятленні тых ці іншых пытанняў рэцэнзенты кіраваліся дамінуючымі ў беларускай савецкай гістарычнай навуцы этатыстычнымі прынцыпамі. У прыватнасці, рэцэнзент У. Палуян адзначаў, што «трэба зняць прозвішчы беларускіх буржуазных нацыяналістаў у тых месцах, дзе аб іх апавядаецца ў станоўчым плане» [19]. Падобнага меркавання прытрымліваўся і рэцэнзент У. Міхнюк: «названы асобныя прозвішчы, якія не могуць прыводзіцца ў станоўчым рэчышчы» [20]. У цэлым рукапіс кнігі быў пазітыўна прыняты калектывам Інстытута, і



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

вучоны савет даў рэкамендацыю для друку дадзенага выдання пасля ўнясення абгавораных выпраўленняў.

У той жа час азнаямленне з гранкамі выдання дазваляе высунуць меркаванне, што рукапіс актыўна перапрацоўваўся на працягу 1982 г. У прыватнасці, была спрошчана структура выдання, рэдакцыйная калегія адмовілася ад структуравання рукапісу на главы, замест гэтага кніга пачала падзяляцца на нарысы, прысвечаныя асобным галінам ведаў, і уводнай часткі, прысвечанай гісторыі і развіццю Інбелкульта, за аўтарствам П. Петрыкава, М. Галенчыка, М. Токарава. У аўтарскі калектыў быў ўключаны рэцэнзент рукапісу У. Палуян, які сумесна з В. Мялешкам перапрацаваў нарыс развіцця гістарычных даследванняў [21].

У першай палове 1983 г. рукапіс кнігі быў здадзены ў выдавецтва «Навука і тэхніка» АН БССР, ён пачаў праходзіць працэдуру знешняга рэцэнзавання [22]. Аўтар водгука, загадчык сектара гісторыі партыі Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ М. Сташкевіч, станоўча ацаніў выданне, адзначыў, што «рукапіс прадстаўляе несумнеўны інтарэс, у ім шмат свежага і цікавага матэрыялу, паднятыя ў ім пытанні заслугоўваюць увагі» [23]. Разам з тым аўтар водгука звяртае ўвагу на шэраг заганаў. Па яго меркаванні аўтарскаму калектыву варта «…узмацніць асвятленне менавіта тых аспектаў, якія характарызавалі ідэйны бок дзейнасці ІБК, барацьбу за развіццё навуковых даследаванняў на марксісцка-ленінскай метадалагічнай аснове…» [24].

У кастрычніку-снежні 1983 г. кніга праходзіла працэдуру карэктуры. Пасля гэтага рукапіс быў перададзены на ўзгадненне ў Галоўліт пры Савеце Міністраў БССР і аддзел навукі Цэнтральнага камітэта КПБ, пасля чаго далейшыя захады па пытанні яго выдання былі прыпынены [25].



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Пэўнае разуменне на прычыны спынення друку кнігі прадстаўляе адрывачнае ліставанне асобных членаў аўтарскага калектыву з вышэйшым партыйным кіраўніцтвам Беларусі. З ліста У. Палуяна, які быў адрасаваны першаму сакратару ЦК КПБ М. Слюнькову 4 красавіка 1984 г., высвятляецца, што прычынай спынення друку кнігі з'яўлялася асвятленне навуковай і навукова-арганізацыйнай дзейнасці У. Ігнатоўскага. Гісторык у сваім лісце даводзіць асноўныя этапы навуковай і грамадска-палітычнай дзейнасці даследчыка і прыходзіць да наступнай высновы адносна ацэнкі постаці У. Ігнатоўскага і перспектываў выдання кнігі: «маецца дастаткова абгрунтаванняў для рэабілітацыі яго не толькі як грамадзяніна і вучонага, але і ў партыйных адносінах, улічваючы пры гэтым, што рэабілітацыя не азначае адмаўлення памылак і цяжкасцей эвалюцыі поглядаў і, што такія памылкі патрабуюць пакарання ў межах партыйных спагнанняў. І ўжо не ў якім выпадку няма ніякіх абгрунтаванняў, каб не выдаваць ці перакройваць і падаваць у іншым святле тыя нешматлікія старонкі, якія напісаны аб ім у кнізе "Інстытут беларускай культуры"» [26].

Мажліва меркаваць, што на момант напісання ліста лёс кнігі не быў яшчэ канчаткова прадвырашаны, болей за тое, гранкі кнігі паступілі зноў у выдавецтва і ў чэрвені 1984 г. рукапіс паступіў да друку [27]. Далейшы лёс кнігі, змены ў яе змесце былі апісаны ў лісце часткі аўтарскага калектыву (аўтарамі ліста з'яўляліся П. Петрыкаў, У. Палуян, В. Мялешка – Д. К.) на адрас сакратара ЦК КПБ А. Кузьміна 18 кастрычніка 1984 г. Змест дадзенага дакумента дэманструе, што даследчыкамі былі здзейснены захады да выпрацоўкі кампрамісу з асобамі, ад якіх залежыла выданне кнігі. Аўтары даводзілі, што яны «…яшчэ раз уважліва прадумалі агульныя ацэначныя



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

палажэнні, дапоўнілі тэкст прынцыповай адзнакай навуковай і грамадска-палітычнай дзейнасці кіраўнікоў Інбелкульта С. Некрашэвіча і У. Ігнатоўскага, паказалі пралікі і памылкі ў працах У. Ігнатоўскага у адпаведнасці з дасягненнямі гістарычнай навукі на сучасным этапе» [28]. Агульная танальнасць ліста была вытрымана ў стылі неабходнасці выдання кнігі, падкрэслівалася «што дадзеная кніга будзе працаваць "на нас", а не "супраць нас"» [29]. Аднак, як паказала развіццё наступных падзей, дадзены ліст не змог паўплываць на лёс кнігі.

Наступныя захады, скіраваныя на публікацыю рукапісу, былі здзейснены ў 1987 г., кніга была ўключана ў выдавецкі план на 1988 г., аднак зноў не выйшла з друку [30]. У рэшце рэшт кніга была апублікавана ў 1993 г. Пэўнае разуменне на прычыны працяглага блакіравання выхаду кнігі дае адзін з яе аўтараў П. Петрыкаў. Ён адзначае, што публікацыя выдання была сарвана прадстаўнікамі «артадаксальнага» крыла гісторыкаў А. Залескім, Р. Кручком у кантэксце палемікі вакол справы па рэабілітацыі У. Ігнатоўскага. Імі праводзілася мэтанакіраваная кампанія па ачарненні постаці навукоўца шляхам ліставання з партыйным кіраўніцтвам Беларусі і праз падрыхтоўку публікацый у сродках масавай інфармацыі [31]. Адной з «ахвяр» падобнай актыўнасці ўзгаданых даследчыкаў стала і кніга, прысвечаная гісторыі Інбелкульта.

Такім чынам, да канца 1970-х гг. у кантэксе развіцця айчыннага навуказнаўства і гісторыі навукі быў закладзены падмурак для падрыхтоўкі манаграфічнага выдання, прысвечанага гісторыі першай навукова-даследчай установы Беларусі – Інбелкульта. Зацікаўленасць акадэмічнай супольнасці ў даследаванні дадзенай старонкі гісторыі спрыяла выпрацоўцы арыгінальнай канцэпцыі выдання як у плане сэнсавага напаўнення, так і спосабе



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

падачы матэрыялу і арганізацыі падрыхтоўкі даследавання. Разам з тым дамінаванне ў беларускай савецкай гістарычнай навуцы і грамадска-палітычным дыскурсе ўяўленняў аб грамадска-палітычнай дзейнасці часткі супрацоўнікаў Інбелкульта і, ў першую чаргу, яго прэзідэнта У. Ігнатоўскага, адцягнула выхад кнігі амаль на цэлае дзесяцігоддзе.

1. Інстытут беларускай культуры / М.П. Касцюк [і інш.]. Мінск, 1993. 254 с.

2. *Ігнатоўскі У.* Ад Беларускай Тэрмінолёгічнай Камісіі да Беларускай Акадэміі навук // Наш край. Менск, 1928. № 12. С. 6–17 ; Інстытут Беларускае Культуры (Інбелкульт): гісторыя ўзьнікненьня, сучасная структура, навукова-дасьледчая дзейнасьць / апрац. навук. сакратар Інбелкульту А.І. Цьвікевіч. Менск, 1926. 114 с.

3. *Шпилевский И.Ф., Бобрович Л.А.* Белорусская Академия Наук на пороге второй пятилетки (исторический очерк) / Белорус. акад. наук, Ин-т истории им. М.Н. Покровского. Минск, 1933. 112 с.

4. *Няміга Г.* Інстытут беларускай культуры – Беларуская Акадэмія навук – Акадэмія навук Беларускай ССР. – Мюнхен, 1957. 162 с.

5. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей ЦНА НАН Беларусі). Ф. 1. Воп. 1. Спр. 1642. Арк. 24–25.

6. *Корзенко Г.В., Шевчук И.И.* Организация историко-научных исследований в Институте истории НАН Беларуси (1973–2013 гг.) : монография. Брест : БрГУ им. А.С. Пушкина, 2015. С. 4.

7. Академия наук Белорусской ССР. Минск : Глав. ред. БелСЭ, 1979. С. 24.

8. ЦНА НАН Беларусі. Ф. 3. Воп. 1. Адз. зах. 758. Арк. 63–64.

9. Там жа. Арк. 64.

10. Там жа. Ф. 1. Воп. 1. Адз. зах. 2130. Арк. 159.

11. Там жа. Ф. 3. Воп. 1. Адз. зах. 758. Арк. 66.


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

12. Там жа. Арк. 69.
13. Там жа. Ф. 1. Воп. 1. Адз. зах. 2213. Арк 284–285.
14. Там жа. Адз. зах. 2223. Арк. 212.
15. Там жа. Адз. зах. 2130. Арк. 284.
16. Там жа. Ф. 3. Воп. 1. Адз. зах. 813. Арк. 203.
17. Там жа.
18. Там жа. Арк. 210.
19. Там жа. Арк. 203.
20. Там жа. Арк. 208, 210.
21. Институт белорусской культуры: очерки научной деятельности. Минск : Наука и техника, 1984. 174 с. – гранки книги. Вариант 2 // Цэнтр даследванняў старадрукаў і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей ЦДСР ЦНБ НАН Беларусі). Ф. 23. Воп. 2. Адз. зах. 553. С. 173–174.
22. Копия письма В.А. Полуяна первому секретарю ЦК КПБ Н.Н. Слюнькову // Там жа. Арк. 1.
23. *Сташкевич Н.С.* Отзыв на рукопись книги «Институт белорусской культуры» // Там жа. Арк. 16.
24. Там жа.
25. Копия письма В.А. Полуяна первому секретарю ЦК КПБ Н.Н. Слюнькову. Арк. 1.
26. Там жа. Арк. 8.
27. Институт белорусской культуры: очерки научной деятельности. С. 27.
28. Копия письма части авторского коллектива книги Институт белорусской культуры секретарю ЦК КПБ А. Кузьмину // ЦДСР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23. Воп. 2. Адз. зах. 553. Арк. 19.
29. Там жа.
30. *Корзенко Г.В., Шевчук И.И.* Организация историко-научных исследований … С. 17.
31. *Петрыкаў П.Ц.* Крытыкі-фальсіфікатары // Акадэмік У.М. Ігнатоўскі : матэрыялы навук. чытанняў, прысвеч. 110-годдзю з дня нарадж. / склад. М.У. Токараў. Мінск, 1993. С. 91–92.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by